**МІНІСТЭРСТВА АРХІТЭКТУРЫ І БУДАЎНІЦТВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**НАВУКОВА-ПРАЕКТНАЕ РЭСПУБЛІКАНСКАЕ УНІТАРНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА «БЕЛНІІПГРАДАБУДАЎНІЦТВА»**

Заказчык: Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь

Н/С
Дагавор № 8-ГР/19
Аб'ект № 14.19
Інв. № 38273
Экз. №

# ДЭТАЛЕВЫ ПЛАН ГІСТАРЫЧНАГА ЦЭНТРА г. ПІНСКА С ПРАЕКТАМ РЭГЕНЕРАЦЫІ ГІСТАРЫЧНАЙ ЗАБУДОВЫ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА
(ЗАЦВЯРДЖАЕМАЯ ЧАСТКА)

## 14.19-00. ТЗ-5

**ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМЫХ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ**


Дырэктар прадпрыемства А.М. Хіжняк

Галоўны архітэктар прадпрыемства В.М. Мазан

Начальнік АПМ В.В. Ляўковіч

Галоўны архітэктар праека М.Ю.Кудраўцава

Галоўны спецыяліст Н.А. Лаўрэцкая


сакавік, 2020 г.

## ЗМЕСТ


Стар.

**УВОДЗІНЫ** .......... 3

**РАЗДЕЛ 1. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ - «БУДЫНАК» ПА ВУЛ. КІРАВА, 22 У Г. ПІНСКУ** .......... 4

1.1. Агульныя палажэнні .......... 4

1.2. Ахоўная зона .......... 4

1.3. Зона рэгулявання забудовы .......... 5

**РАЗДЕЛ 2. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ - «БЫЛАЯ РЕЛІГІЙНАЯ ШКОЛА» ПА ВУЛ. КУЛІКОВА, 29 У Г. ПІНСКУ** .......... 6

1.1. Агульныя палажэнні .......... 6

1.2. Ахоўная зона .......... 7

1.3. Зона рэгулявання забудовы .......... 7

**РАЗДЕЛ 3. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ - «ПОМНІК НА МЕСЦЫ ЗАБОЙСТВА АХВЯР ФАШЫЗМУ – ВЯЗНЯЎ ПІНСКАГА ГЕТА» ПА ВУЛ. ПУШКІНА Ў Г. ПІНСКУ** .......... 9

1.1. Агульныя палажэнні .......... 9

1.2. Ахоўная зона .......... 9

1.3. Зона аховы ландшафту .......... 10

**РАЗДЕЛ 4. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ - «БУДЫНАК» ПА ВУЛ. СУВОРАВА, 43 У Г. ПІНСКУ** .......... 11

1.1. Агульныя палажэнні .......... 11

1.2. Ахоўная зона .......... 12

1.3. Зона рэгулявання забудовы .......... 12

1.4. Зона аховы ландшафту .......... 13

**ДАДАТАК** ..........

Фотафіксацыя .......... 14

Схема зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці – «Будынак» па вул. Кірава, 22 у г. Пінску .......... 25

Схема зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці - «Былая рэлігійная школа» па вул. Кулікова, 29 у г. Пінску .......... 26

Схема зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці - «Помнік на месцы забойства ахвяр фашызму – вязняў Пінскага гета» па вул. Пушкіна у г. Пінску .......... 27

Схема зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці - «Будынак» па вул. Суворава, 43 у г. Пінску .......... 28

# Уводзіны

Згодна з дзеючым законадаўствам у гарадах і населеных пунктах, маючых гісторыка-культурныя каштоўнасці, неабходна ўстанавіць для іх зоны аховы і вызначыць рэжымы ўтрымання гэтых зон.

На дадзены момант пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 22.07.2010 № 20 зацверджаны праект зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці "Гістарычны цэнтр г. Пінска" з вылучэннем ахоўных зон гісторыка-культурных каштоўнасцей – "Ансамбль былога кляштара бернардзінцаў" і "Касцел Карла Барамея" (распрацаваны УП "БЕЛНІІПГРАДАБУДАЎНІЦТВА» ў складзе праекта дэталевана плана цэнтральнай часткі г. Пінска са схемай рэгенерацыі гістарычнай забудовы, аб'ект № 07.07).

У складзе праекта "Дэталевы план гістарычнага цэнтра г. Пінска з праектам рэгенерацыі гістарычнай забудовы" дадаткова распрацаваны праекты зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія размешчаны ў межах тэрыторыі дэталевага плана, але знаходзяцца па-за мяжой гістарычнага цэнтра г. Пінска.

Праекты зон аховы распрацаваны для наступных гістрыка-культурных каштоўнасцей, ўнесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад асобнымі шыфрамі ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 "Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей":

"Будынак" (1920-я гады), г. Пінск, вул. Кірава, 22, катэгорыя 3, шыфр 113Г000738;

"Былая рэлігійная школа" (канец XIX – пачатак XX стагоддзя), г. Пінск, вул. Кулікова, 29, катэгорыя 3, шыфр 113Г000740;

"Помнік на месцы забойства ахвяр фашызму – вязняў Пінскага гета" (1993 год, 2005 год), г. Пінск, вул. Пушкіна, катэгорыя 3, шыфр 113Д000720;

"Будынак" (другая палова XIX – пачатак XX стагоддзя), г. Пінск, вул. Суворава, 43, катэгорыя 2, шыфр 112Г000545.

# РАЗДЗЕЛ 1. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ – “БУДЫНАК” ПА ВУЛ. КІРАВА, 22 У Г. ПІНСКУ

## Глава 1. Агульныя палажэнні

Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці - "Будынак” па вул. Кірава, 22 у г. Пінску (далей - праект зон аховы) разпрацаваны на падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

Будынак (1920-я гады) з'яўляецца нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю катэгорыі "3" (далей - гісторыка-культурная каштоўнасць), якая ўнесена у Дзяржаўны спіс гістрыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 113Г000738 у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей”.

Праект зон аховы распрацаваны ўнітарным прадпрыемствам "БЕЛНІІПГРАДАБУДАЎНІЦТВА" па заказу Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь у складзе праекта "Дэталевы план гістарычнага цэнтра г. Пінска з праектам рэгенерацыі гістарычнай забудовы".

Праект зон аховы распрацаваны з мэтай забеспячэння захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і навакольнага асяроддзя, заключаецца ў вызначэнні межаў зон аховы і ўстанаўленні рэжымаў іх утрымання і выкарыстання.

Праект зон аховы распрацаваны на падставе гісторыка-архіўных, бібліяграфічных і натурных даследаванняў, аналізу існуючай горадабудаўнічай сітуацыі і ландшафту.

Праектам зон аховы ўстаноўлены наступныя зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці: ахоўная зона, зона рэгулявання забудовы. Схема зон аховы дадаецца.

## Глава 2. Ахоўная зона

Ахоўная зона гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлена зыходзячы з умоў захавання будынка і стварэння спрыяльных умоў для яго ўспрымання.

Плошча ахоўнай зоны складае 0,12 га.

Межамі ахоўнай зоны з'яўляюцца:

на паўночным захадзе, паўночным усходзе, паўдневым усходзе і паўдневым захадзе - лінія, якая ідзе ўздоўж мяжы ўчастка па вул. Кірава, 22 – кропкі 1, 2, 3, 4.

На тэрыторыі ахоўнай зоны забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў;

усталяванне сродкаў вонкавай рэкламы;

правядзенне работ па захаванні гісторыка-культурнай каштоўнасці, якімі прадугледжаны навукова неабгрунтаваныя змяненні ў аб'емна-прасторавым, архітэктурным і канструктыўным рашэнні;

правядзенне работ па добраупарадкаванні тэрыторыі без праектнай дакументацыі, распрацаванай і ўзгодненай ва ўстаноўленым парадку.

## Глава 3. Зона рэгулявання забудовы

Зона рэгулявання забудовы ўстаноўлена зыходзячы з неабходнасці рэгламентавання маштабу новага будаўніцтва і рэканструкцыі існуючай забудовы на тэрыторыі, прылеглай да тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці. Межы зоны рэгулявання забудовы ўстаноўлены з улікам сучаснай горадабудаўнічай сітуацыі.

Зона рэгулявання забудовы складаецца з двух участкаў.

Плошча зоны рэгулявання забудовы складае 0,61 га.

Межамі першага ўчастка зоны рэгулявання забудовы з'яўляюцца:

на паўночным захадзе, - лінія, якая ідзе ўздоўж тратуара ад мяжы ўчастка па вул. Кірава, 22 да паўночна-усходняга фасада будынка па вул. Альхоўскіх, 22 ад кропкі 1 да кропкі 5;

на паўдневым захадзе, - лінія, якая ідзе ўздоўж фасадаў будынка па вул. Альхоўскіх, 22 – кропкі 5, 6, 7, 8;

на паўдневым усходзе - лінія, якая ідзе перпендыкулярна напрамку вул. Насырава ад будынка па вул. Альхоўскіх, 22 на адлегласць 20 м ад кропкі 8 да кропкі 9;

на паўночным усходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж мяжы участка будынка па вул. Альхоўскіх, 22 да мяжы ахоўнай зоны ад кропкі 9 да кропкі 3; далей – уздоўж мяжы ахоўнай зоны – кропкі 3, 4, 1.

Межамі другога ўчастка зоны рэгулявання забудовы з'яўляюцца:

на паўдневым усходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж паўночна-захадняга фасада будынка па вул. Кірава, 24 да мяжы ўчастка – кропкі 10, 11, 12, 13;

на паўночным усходзе і паўночным захадзе - лінія, якая ідзе ўздоўж паўночна-усходняй і паўночна-заходняй мяжы ўчастка па вул. Кірава, 24 – кропкі 13, 14, 15;

на паўдневым захадзе - лінія, якая ідзе ў створы паўднева-заходняга фасада будынка па вул. Кірава, 24 ад паўночна-заходняй мяжы ўчастка да будынка па вул. Кірава, 24 ад крокі 15 да кропкі 10.

На тэрыторыі зоны рэгулявання забудовы забараняецца:

размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў, камунальна-складскіх аб'ектаў і іншых збудаванняў, якія павялічваюць грузавыя патокі, забруджваюць паветраны і водны басейны, з'яўляюцца выбухова- і пажаранебяспечнымі;

новае будаўніцтва і рэканструкцыя існуючай забудовы без выкарыстання гістарычнага модуля па працягласці фасадаў і вышыні

прылягаючай забудовы (вышэй за 9 м ад узроўню зямлі да вышэйшай кропкі даху, вышэй за 2 паверхі).

**Геаграфічныя каардынаты межаў зон аховы**

| № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 52.118760˚/ 26.113619˚ | 5 | 52.118552˚/ 26.113244˚ | 9 | 52.118162˚/ 26.115056˚ | 13 | 52.119353˚/ 26.115348˚ |
| 2 | 52.118927˚/ 26.113838˚ | 6 | 52.118133˚/ 26.113912˚ | 10 | 52.118955˚/ 26.114265˚ | 14 | 52.119549˚/ 26.115107˚ |
| 3 | 52.118637˚/ 26.114341˚ | 7 | 52.118372˚/ 26.114344˚ | 11 | 52.119073˚/ 26.114379˚ | 15 | 52.119060˚/ 26.114113˚ |
| 4 | 52.118481˚/ 26.114001˚ | 8 | 52.118050˚/ 26.114812˚ | 12 | 52.118987˚/ 26.114618˚ | | |

# РАЗДЗЕЛ 2. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ – “БЫЛАЯ РЭЛІГІЙНАЯ ШКОЛА” ПА ВУЛ. КУЛІКОВА, 29 У Г. ПІНСКУ

## Глава 1. Агульныя палажэнні

Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці - "Былая рэлігійная школа” па вул. Кулікова, 29 у г. Пінску (далей - праект зон аховы) разпрацаваны на падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

Былая рэлігійная школа (канец XIX – пачатак XX стагоддзя) з'яўляецца нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю катэгорыі "3" (далей - гісторыка-культурная каштоўнасць), якая ўнесена у Дзяржаўны спіс гістрыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 113Г000740 у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей”.

Праект зон аховы распрацаваны ўнітарным прадпрыемствам "БЕЛНІІПГРАДАБУДАЎНІЦТВА" па заказу Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь у складзе праекта "Дэталевы план гістарычнага цэнтра г. Пінска з праектам рэгенерацыі гістарычнай забудовы".

Праект зон аховы распрацаваны з мэтай забеспячэння захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і навакольнага асяроддзя, заключаецца ў вызначэнні межаў зон аховы і ўстанаўленні рэжымаў іх утрымання і выкарыстання.

Праект зон аховы распрацаваны на падставе гісторыка-архіўных, бібліяграфічных і натурных даследаванняў, аналізу існуючай горадабудаўнічай сітуацыі і ландшафту.

Праектам зон аховы ўстаноўлены наступныя зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці: ахоўная зона, зона рэгулявання забудовы. Схема зон аховы дадаецца.

## Глава 2. Ахоўная зона

Ахоўная зона гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлена зыходзячы з умоў захавання будынка і стварэння спрыяльных умоў для яго ўспрымання.

Плошча ахоўнай зоны складае 0,19 га.

Межамі ахоўнай зоны з'яўляюцца:

на паўночным захадзе і паўночным усходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж мяжы ўчасткаў №№ 31, 29 па вул. Кулікова – кропкі 1, 2, 3;

на паўднёвым усходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж паўднёва-усходняга фасада будынка па вул. Кулікова, 29 да ўнутрыквартальнага праезда ад кропкі 3 да кропкі 4;

на паўднёвым захадзе - лінія, якая ідзе па ўнутрыквартальнаму праезду да паўночна-заходняй мяжы ўчастка па вул. Кулікова, 31 - кропкі 4, 5, 1.

На тэрыторыі ахоўнай зоны забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў;

усталяванне сродкаў вонкавай рэкламы;

правядзенне работ па захаванні гісторыка-культурнай каштоўнасці, якімі прадугледжаны навукова неабгрунтаваныя змяненні ў аб'ёмна-прасторавым, архітэктурным і канструктыўным рашэнні;

правядзенне работ па добраўпарадкаванні тэрыторыі без праектнай дакументацыі, распрацаванай і ўзгодненай ва ўстаноўленым парадку.

## Глава 3. Зона рэгулявання забудовы

Зона рэгулявання забудовы ўстаноўлена зыходзячы з неабходнасці рэгламентавання маштабу новага будаўніцтва і рэканструкцыі існуючай забудовы на тэрыторыі, прылеглай да тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці. Межы зоны рэгулявання забудовы ўстаноўлены з улікам сучаснай горадабудаўнічай сітуацыі.

Зона рэгулявання забудовы складаецца з двух участкаў.

Плошча зоны рэгулявання забудовы складае 1,18 га.

Межамі першага ўчастка зоны рэгулявання забудовы з'яўляюцца:

на паўднёвым усходзе і паўднёвым захадзе - лінія, якая ідзе ўздоўж тратуара па вул. Кулікова ад перакрыжавання з вул. Пушкіна да мяжы ахоўнай зоны ад кропкі 6 да кропкі 5; уздоўж мяжы ахоўнай зоны – кропкі 3, 2, 1, 5, 4; далей – паралельна напрамку вул. Кулікова ад унутрыквартальнага

праезда на адлегласць 84 м ад кропкі 4 да кропкі 7; перпендыкулярна напрамку вул. Кулікова на адлегласць 20 м ад кропкі 7 да кропкі 8;

на паўночным захадзе - лінія, якая ідзе ўздоўж паўднева-усходняга фасада будынка па вул. Кулікова 27 ад кропкі 8 да кропкі 9; уздоўж паўночна –усходняга фасада будынка па вул. Кулікова 27 на адлегласць 65 м ад кропкі 9 да кропкі 10; далей – па ўнутрыквартальнай тэрыторыі перпендыкулярна напрамку вул. Пушкіна ў створы з паўночна-заходнім фасадам будынка па вул. Пушкіна, 5 да перасячэння з тратуарам ад кропкі 10 да кропкі 11;

на паўночным усходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж тратуара па вул. Пушкіна да перакрыжавання з вул. Кулікова ад кропкі 11 да кропкі 6.

Межамі другога ўчастка зоны рэгулявання забудовы з'яўляюцца:

на паўночным захадзе - лінія, якая ідзе ў створы з паўночна-заходнім фасадам будынка па вул. Кулікова, 28 ад будынка па вул. Кулікова, 30 да будынка па вул. Кулікова, 26 ад кропкі 12 да кропкі 13;

на паўдневым захадзе і паўдневым усходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж паўночна-усходняга фасада па вул. Кулікова, 26 на адлегласць 35 м ад кропкі 13 да кропкі 14; далей – па ўнутрыквартальнай тэрыторыі паралельна напрамку вул. Кулікова да ўнутрыдваравога праезда ад кропкі 14 да кропкі 15;

на паўночным усходзе - лінія, якая ідзе па ўнутрыдваравому праезду ўздоўж паўднева-заходняга фасада па вул. Кулікова, 30 ад кропкі 15 да кропкі 12.

На тэрыторыі зоны рэгулявання забудовы забараняецца:

размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў, камунальна-складскіх аб'ектаў і іншых збудаванняў, якія павялічваюць грузавыя патокі, забруджваюць паветраны і водны басейны, з'яўляюцца выбухова- і пажаранебяспечнымі;

новае будаўніцтва і рэканструкцыя існуючай забудовы без выкарыстання гістарычнага модуля па працягласці фасадаў і вышыні прылягаючай забудовы (вышэй за 10 м ад узроўню зямлі да вышэйшай кропкі даху, вышэй за 2 паверхі з мансардай).

**Геаграфічныя каардынаты межаў зон аховы**

| № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 52.118238°/ 26.117411° | 5 | 52.117908°/ 26.117674° | 9 | 52.117770°/ 26.117293° | 13 | 52.117748°/ 26.117990° |
| 2 | 52.118406°/ 26.117722° | 6 | 52.118496°/ 26.118771° | 10 | 52.118186°/ 26.116582° | 14 | 52.117542°/ 26.118376° |
| 3 | 52.118126°/ 26.118256° | 7 | 52.117309°/ 26.116907° | 11 | 52.118995°/ 26.117998° | 15 | 52.117864°/ 26.118862° |
| 4 | 52.117832°/ 26.117808° | 8 | 52.117416°/ 26.116711° | 12 | 52.118197°/ 26.118501° | | |

## РАЗДЗЕЛ 3. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ – “ПОМНІК НА МЕСЦЫ ЗАБОЙСТВА АХВЯР ФАШЫЗМУ – ВЯЗНЯЎ ПІНСКАГА ГЕТА” ПА ВУЛ. ПУШКІНА У Г. ПІНСКУ

### Глава 1. Агульныя палажэнні

Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці - "Помнік на месцы забойства ахвяр фашызму – вязняў Пінскага гета” па вул. Пушкіна ў г. Пінску (далей - праект зон аховы) разпрацаваны на падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

Помнік на месцы забойства ахвяр фашызму – вязняў Пінскага гета (1993 год, 2005 год) з'яўляецца нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю катэгорыі "3" (далей - гісторыка-культурная каштоўнасць), якая ўнесена у Дзяржаўны спіс гістрыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 113Д000720 у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 “Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей”.

Праект зон аховы распрацаваны ўнітарным прадпрыемствам "БЕЛНІІПГРАДАБУДАЎНІЦТВА" па заказу Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь у складзе праекта "Дэталевы план гістарычнага цэнтра г. Пінска з праектам рэгенерацыі гістарычнай забудовы".

Праект зон аховы распрацаваны з мэтай забеспячэння захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і навакольнага асяроддзя, заключаецца ў вызначэнні межаў зон аховы і ўстанаўленні рэжымаў іх утрымання і выкарыстання.

Праект зон аховы распрацаваны на падставе гісторыка-архіўных, бібліяграфічных і натурных даследаванняў, аналізу існуючай горадабудаўнічай сітуацыі і ландшафту.

Праектам зон аховы ўстаноўлены наступныя зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці: ахоўная зона, зона аховы ландшафту. Схема зон аховы дадаецца.

### Глава 2. Ахоўная зона

Ахоўная зона гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлена зыходзячы з умоў захавання помніка і стварэння спрыяльных умоў для яго ўспрымання.

Плошча ахоўнай зоны складае 0,03 га.

Межамі ахоўнай зоны з'яўляюцца:

на паўднёвым усходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж праезда да будынка па вул. Пушкіна, 27 ад тратуара на адлегласць 14 м ад кропкі 1 да кропкі 2;

на паўдневым захадзе і паўночным захадзе - лінія, якая ідзе перпендыкулярна праезду на адлегласць 18 м да перасячэння з дыяганальнай пешаходнай дарожкай ад кропкі 2 да кропкі 3; далей – уздоўж гэтай дарожкі на адлегласць 15 м да перасячэння з тратуарам ад кропкі 3 да кропкі 4;

на паўночным усходзе – лінія, якая ідзе ўздоўж тратуара па вул. Пушкіна ад пешаходнай дарожкі да праезда ад кропкі 4 да кропкі 1.

На тэрыторыі ахоўнай зоны забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў;

усталяванне сродкаў вонкавай рэкламы;

правядзенне работ па захаванні гісторыка-культурнай каштоўнасці, якімі прадугледжаны навукова неабгрунтаваныя змяненні ў аб'емна-прасторавым, архітэктурным і канструктыўным рашэнні;

правядзенне работ па добраупарадкаванні тэрыторыі без праектнай дакументацыі, распрацаванай і ўзгодненай ва ўстаноўленым парадку.

## Глава 3. Зона аховы ландшафту

Зона аховы ландшафту ўстаноўлена зыходзячы з неабходнасці захавання зяленай зоны (тэрыторыя былых могілак), якая мае візуальную сувязь з гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

Плошча зоны аховы ландшафту складае 0,31 га.

Межамі зоны аховы ландшафту з'яўляюцца:

на паўночным уходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж тратуара ад будынка па вул. Пушкіна, 25а да мяжы ахоўнай зоны ад кропкі 5 да кропкі 1; уздоўж мяжы ахоўнай зоны і далей – да паўднева-усходняй мяжы ўчастка па вул. Пушкіна, 29 – кропкі 1, 2, 3, 4, 6;

на паўночным захадзе – лінія, якая ідзе ўздоўж паўднева-усходняй мяжы ўчастка па вул. Пушкіна, 29 ад тратуара на адлегласць 28 м ад кропкі 6 да кропкі 7;

на паўдневым захадзе і паўдневым усходзе – лінія, якая ідзе ўздоўж паўночна-усходняга фасада будынка па вул. Пушкіна, 27 да перасячэння з умоўнай лініяй, праведзенай уздоўж паўночна-заходняга фасада будынка па вул. Пушкіна, 25а і далей – уздоўж гэтага фасада да перасячэння з тратуарам – кропкі 7, 8, 5.

У зоне аховы ландшафту забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў;

змяненне існуючага рэльефу і характару ландшафту;

высечка дрэў акрамя аб’ектаў расліннага свету, якія знаходзяцца ў неналежным (аварыйным) стане, а таксама акрамя санітарных рубак;

ажыццяўленне дзейнасці без выканання Правілаў добраупарадкавання мемарыялаў і помнікаў воінскай славы, адзіночных і брацкіх магіл воінаў, загінуўшых у гады Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, воінскіх могілак, асобных воінскіх участкаў агульных могілак, месцаў масавага

пахавання грамадзянскага насельніцтва, зацверджаных пастановай Савета міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 верасня 2018 г. № 675.

**Геаграфічныя каардынаты межаў зон аховы**

| № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 52.122266°/ 26.112895° | 3 | 52.122306°/ 26.112597° | 5 | 52.121924°/ 26.113383° | 7 | 52.122261°/ 26.112125° |
| 2 | 52.122187°/ 26.112774° | 4 | 52.122434°/ 26.112643° | 6 | 52.122492°/ 26.112511° | 8 | 52.121645°/ 26.112960° |

# РАЗДЗЕЛ 4. ПРАЕКТ ЗОН АХОВЫ НЕРУХОМАЙ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ – "БУДЫНАК" ПА ВУЛ. СУВОРАВА, 43 У Г. ПІНСКУ

## Глава 1. Агульныя палажэнні

Праект зон аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці - "Будынак" па вул. Суворава, 43 у г. Пінску (далей - праект зон аховы) разпрацаваны на падставе пункта 3 артыкула 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

Будынак (другая палова XIX – пачатак XX стагоддзя) з'яўляецца нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю катэгорыі "2" (далей - гісторыка-культурная каштоўнасць), якая ўнесена у Дзяржаўны спіс гістрыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пад шыфрам 112Г000545 у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 "Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей".

Праект зон аховы распрацаваны ўнітарным прадпрыемствам "БЕЛНІІПГРАДАБУДАЎНІЦТВА" па заказу Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь ў складзе праекта "Дэталевы план гістарычнага цэнтра г. Пінска з праектам рэгенерацыі гістарычнай забудовы".

Праект зон аховы распрацаваны з мэтай забеспячэння захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і навакольнага асяроддзя, заключаецца ў вызначэнні межаў зон аховы і ўстанаўленні рэжымаў іх утрымання і выкарыстання.

Праект зон аховы распрацаваны на падставе гісторыка-архіўных, бібліяграфічных і натурных даследаванняў, аналізу існуючай горадабудаўнічай сітуацыі і ландшафту.

Праектам зон аховы ўстаноўлены наступныя зоны аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці: ахоўная зона, зона рэгулявання забудовы, зона аховы ландшафту. Схема зон аховы дадаецца.

## Глава 2. Ахоўная зона

Ахоўная зона гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлена зыходзячы з умоў захавання будынка і стварэння спрыяльных умоў для яго ўспрымання.

Плошча ахоўнай зоны складае 0,1 га.

Межамі ахоўнай зоны з'яўляюцца:

на поўдні - лінія, якая ідзе ўздоўж праезнай часткі вул. Суворава ад заходняга фасада будынка па вул. Камсамольскай, 61 на адлегласць 33 м да заходняй мяжы ўнутрыдваравога праезда ад кропкі 1 да кропкі 2;

на захадзе - лінія, якая ідзе ўздоўж заходняй мяжы ўнутрыдваравога праезда ад вул. Суворава да паўднёвага фасада будынка па вул. Першамайскай, 48 ад кропкі 2 да кропкі 3;

на поўначы - лінія, якая ідзе ўздоўж паўднёвага фасада будынка па вул. Першамайскай, 48 да заходняга фасада будынка па вул. Камсамольскай, 61 ад кропкі 3 да кропкі 4;

на ўсходзе – лінія, якая ідзе ўздоўж заходняга фасада будынка па вул. Камсамольскай, 61 да перасячэння з праезнай часткай вул. Суворава - кропкі 4, 5, 6, 1;

На тэрыторыі ахоўнай зоны забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў;

усталяванне сродкаў вонкавай рэкламы;

правядзенне работ па захаванні гісторыка-культурнай каштоўнасці, якімі прадугледжаны навукова неабгрунтаваныя змяненні ў аб'емна-прасторавым, архітэктурным і канструктыўным рашэнні;

правядзенне работ па добраупарадкаванні тэрыторыі без праектнай дакументацыі, распрацаванай і ўзгодненай ва ўстаноўленым парадку.

## Глава 3. Зона рэгулявання забудовы

Зона рэгулявання забудовы ўстаноўлена зыходзячы з неабходнасці рэгламентавання маштабу новага будаўніцтва і рэканструкцыі існуючай забудовы на тэрыторыі, прылеглай да тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці. Межы зоны рэгулявання забудовы ўстаноўлены з улікам сучаснай горадабудаўнічай сітуацыі.

Плошча зоны рэгулявання забудовы складае 0,18 га.

Межамі зоны рэгулявання забудовы з'яўляюцца:

на ўсходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж праезнай часткі вул. Камсамольскай ад перакрыжавання з вул. Суворава на адлегласць 48 м ад кропкі 7 да кропкі 8;

на паўдні - лінія, якая ідзе ад праезнай часткі вул. Камсамольскай да паўднёвага фасада будынка па вул. Першамайскай, 46, далей – уздоўж усходняга і паўночнага фасада будынка па вул. Першамайскай, 46 і

паўночнага фасада будынка па вул. Першамайскай, 48 да перасячэння з праезнай часткай вул. Першамайскай - кропкі 8, 9, 10, 11;

на захадзе і поўначы - лінія, якая ідзе ўздоўж праезнай часткі вул. Суворава ад вул. Першамайскай да вул. Камсамольскай ад кропкі 11 да кропкі 7.

На тэрыторыі зоны рэгулявання забудовы забараняецца:

размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў, камунальна-складскіх аб'ектаў і іншых збудаванняў, якія павялічваюць грузавыя патокі, забруджваюць паветраны і водны басейны, з'яўляюцца выбухова- і пажаранебяспечнымі;

новае будаўніцтва і рэканструкцыя існуючай забудовы без выкарыстання гістарычнага модуля па працягласці фасадаў і вышыні прылягаючай забудовы (вышэй за 9 м ад узроўню зямлі да вышэйшай кропкі даху, вышэй за 2 паверхі).

## Глава 4. Зона аховы ландшафту

Зона аховы ландшафту ўстаноўлена зыходзячы з неабходнасці захавання зяленай зоны, якая мае візуальную сувязь з гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

Плошча зоны аховы ландшафту складае 0,04 га.

Межамі зоны аховы ландшафту з'яўляюцца:

на ўходзе - лінія, якая ідзе ўздоўж заходняй мяжы ахоўнай зоны ад кропкі 2 да кропкі 3;

на поўначы - лінія, якая ідзе ад паўднёвага фасада будынка па вул. Першамайскай, 48 да праезнай часткі вул. Першамайскай ад кропкі 3 да кропкі 12;

на захадзе і поўдні - лінія, якая ідзе ўздоўж праезнай часткі вул. Першамайскай да паўднёвай мяжы ахоўнай зоны ад кропкі 12 да кропкі 2.

У зоне аховы ландшафту забараняецца:

узвядзенне будынкаў і збудаванняў;

змяненне існуючага рэльефу і характару ландшафту.

**Геаграфічныя каардынаты межаў зон аховы**

| № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. | № кр. | Каардынаты п.ш./у.д. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 52.118352°/ 26.102504° | 4 | 52.118564°/ 26.102402° | 7 | 52.118349°/ 26.102839° | 10 | 52.118111°/ 26.102751° |
| 2 | 52.118256°/ 26.102028° | 5 | 52.118474°/ 26.102457° | 8 | 52.117949°/ 26.103040° | 11 | 52.118024°/ 26.101914° |
| 3 | 52.118504°/ 26.101911° | 6 | 52.118448°/ 26.102396° | 9 | 52.117909°/ 26.102808° | 12 | 52.118502°/ 26.101801° |

**Фотафіксацыя**



Від на будынак па вул. Кірава, 22 з вул. Насырава



Будынак па вул. Кірава, 22



Забудова па вул. Кірава



Забудова па вул. Кірава




Будынак па вул. Кірава, 22






Від на прылеглую забудову ад вул. Насырава





Забудова па вул. Насырава



Забудова па вул. Кірава



Забудова па вул. Кірава





Від на забудову па вул. Кулікова ад вул. Пушкіна



Будынак па вул. Кулікова, 29







Забудова па вул. Кулікова







Унутрыдваровая забудова па вул. Кулікова, 29, 31






Помнік на месцы забойства ахвяр фашызму – вязняў Пінскага гета



Від на помнік з боку аул. Пушкіна







Від на помнік і сквер на вул. Пушкіна






Від на забудову вул. Суворава з вул. Першамайскай







Будынак па вул. Суворава, 43



Будынак па вул. Суворава, 43




Від на забудову па вул. Суворава

